# СОНЕЙКА АСЕННЯЕ

*Сл. і муз. Я. Жабко*




Сонейка асенняе
Золатам спавітае,
Расшывае лісцікі
Ніткай залатой.

І стаіць рабіначка
Чырванню залітая.
Восень зачароўвае
Казачнай красой.

І лятаюць срэбныя
Ніткі-павуцiначкі,
Падаюць на золата
Восеньскай зямлі.

І на золку свецяцца
Кропелькі-расiначкі,
І курлычуць песню нам
Ў небе жураўлі.

# ПАДАРУНАЧКІ

*Сл. і муз. Я. Жабко*




У мяне такі настрой,
Што я заспявала.
Сёння мама персцянёчак
Мне падаравала.

**Прыпеў:**

Ой, люблю, ой, люблю,
Люблю падаруначкі!
Ўсю касметыку, уборы,
Цацкі і ласуначкі.

Новы год, жаночы дзень
Вельмі я чакаю.
Падарункі ў дзень народзін
Хутка атрымаю.

**Прыпеў.**

Падаруначкі дарыць
І мне так прыемна.
Спляла з бісеру пярсцёнак
Маме узаемна.

**Прыпеў:**

Любяць ўсе, любяць ўсе,
Любяць падаруначкі.
Ўсю касметыку, уборы,
Цацкі і ласуначкі.

# ЛЯНОТА

*Сл. і муз. Я. Жабко*




Каціна сябровачка — лянота.
Справу яна робіць без ахвоты.
А яшчэ ў прыдачу — негадуе.
Пакажу вам, як яна працуе:

**Прыпеў:**
Цяп-ляп, цяп-ляп, цяп-ляп.
Цяп-ляп, цяп-ляп, цяп-ляп.
Гэта значыць, наша Каця
Справу робіць абы-як.

Ведаем, дзе праца — будзе густа.
Ну, а дзе лянота — будзе пуста.
Каб парадак быў у вашай хаце,
Працаваць не трэба так, як Каця.
**Прыпеў.**